Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**Зацвярджаю**
Нам. старшыні Вучэбна-метадычнага аб'яднання ВНУ Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

_____________ М.Л.Кузьмініч
"____"___________ 2008 г.
Рэгістрацыйны № _____КМ/тып.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ

*Вучэбная праграма для студэнтаў ВНУ па спецыяльнасці 23 01 12-03 – музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

Мінск 2008

**Складальнік**

***А. А. Трусаў,*** кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства

**Рэцэнзенты**

***А. У. Карпенка,*** загадчык аддзела старажытнабеларускага мастацтва Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь;

***І. М. Чарняўскі,*** намеснік начальніка Упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендавана** да зацвярджэння ў якасці тыпавой прэзідыумам вучэбна-метадычнага савета Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў (пратакол № 9 ад 14.06.2007 г.) і навукова-метадычным саветам па культуры, бібліятэказнаўстве і бібліяграфіі (пратакол № 3 ад 27.12.2007 г.)

Адказны за рэдакцыю *Л.Ц.Спірыдонава*
Адказны за выпуск *Р.А.Ровіна*

# УСТУП

Праграма курса “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” прызначана для студэнтаў па спецыяльнасці “музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны”.

Авалоданне тэарэтычнымі ведамі і практычнымі навыкамі ў дадзеным кірунку дазваляе падрыхтаваць добрага спецыяліста не толькі ў галіне музейнай справы, але і ў справе аховы гісторыка-культурнай спадчыны. У працэсе вывучэння курса студэнты набываюць веды па гісторыі еўрапейскай рэстаўрацыі, а таксама па гісторыі ўзнікнення і развіцця рэстаўрацыйнай справы на тэрыторыі Беларусі і сумежных краін. Студэнт павінен добра арыентавацца ў відах работ на гісторыка-культурных каштоўнасцях, парадку правядзення на іх работ, ведаць прававыя паўнамоцтвы навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых праектных і вытворчых работ на аб’екце рэстаўрацыі.

Пасля вывучэння курса “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” *студэнты павінны ведаць:*

– прынцыпы рэстаўрацыі і кансервацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей, праблемы і складанасці ў рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры і мастацтва ў Еўропе і Беларусі;

– метадалогію вывучэння помнікаў гісторыі і культуры падчас кансервацыі і рэстаўрацыі, дасягненні замежных і айчынных даследчыкаў у дадзенай галіне.

*Студэнты павінны умець:*

– выкарыстоўваць неабходныя пісьмовыя крыніцы;

– выяўляць прычыны і віды разбурэнняў помнікаў гісторыі і культуры;

– выкарыстоўваць тэхналогію рэстаўрацыі і кансервацыі розных музейных экспанатаў.

Курс “Асновы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры” непасрэдна звязаны з выкладаннем гісторыі архітэктуры, археалогіі, этналогіі, палявой археалогіі, гісторыі матэрыяльнай культуры, навукова-фондавай работы ў музеях і ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей.

У межах вывучэння курса прадугледжаны наступныя віды заняткаў: лекцыі, семінары, заданні для самастойнай работы студэнтаў і курсавая работа.

Па выніках вывучэння дысцыпліны праводзяцца залік і экзамен.

# ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН КУРСА

| Раздзелы і тэмы | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | лекцыі | семін. зан. | сам. раб. |
| **Уводзіны**. Асноўная рэстаўрацыйная тэрміналогія. Сістэма крытэрыяў каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь | 2 | 2 | | |
| **Раздзел I. Гісторыя еўрапейскай рэстаўрацыі** | | | | |
| ***Тэма 1.*** Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX – пачатку XX ст. Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 2.*** Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 3.*** Рэстаўрацыя помнікаў Літвы | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 4.*** Рэстаўрацыя помнікаў Польшчы | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 5.*** Рэстаўрацыя помнікаў Польшчы і Літвы | 4 | | | 4 |
| **Раздзел II. Гісторыя беларускай рэстаўрацыі і аховы помнікаў** | | | | |
| ***Тэма 6.*** Ахова і рэстаўрацыя помнікаў Беларусі XVI – пачатку XX ст. | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 7.*** Рэстаўрацыя і ахова помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 8.*** Ахова помнікаў ў Беларусі ў XX ст. (пасля 1917 г.) | 4 | | | 4 |
| ***Тэма 9.*** Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 10.*** Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Віцебшчыны (Віцебск, Полацк, Орша) | 4 | | | 4 |
| ***Тэма 11.*** Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Магілёўшчыны (Магілёў, Мсціслаў, Быхаў) | 4 | | | 4 |
| ***Тэма 12.*** Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў (Мірскі, Нясвіжскі, Крэўскі, Навагрудскі і Лідскі) | 4 | | 2 | 2 |
| ***Тэма 13.*** Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска | 10 | | | 10 |
| ***Тэма 14.*** Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска (семінар праходзіць у Верхнім горадзе) | 4 | | 4 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 15.*** Аналіз публікацый па захаванні гістарычнай спадчыны старога Мінска і іншых гістарычных гарадоў Беларусі | 14 | | | 14 |
| **Раздзел III. Тэорыя і практыка сучаснай рэстаўрацыі** | | | | |
| ***Тэма 16.*** Асноўныя прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 17.*** Прынцыпы рэстаўрацыі руінных помнікаў архітэктуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 18.*** Даследаванні помнікаў архітэктуры падчас рэстаўрацыі. Асноўныя патрабаванні да навуковага праекта рэстаўрацыі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 19.*** Міжнародныя арганізацыі па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 20.*** Праблемы рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі ў музеях іншых краін | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 21.*** Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў народнага дойлідства | 4 | | | 4 |
| ***Тэма 22.*** Захаванне, вывучэнне і рэстаўрацыя помнікаў народнай архітэктуры | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 23.*** Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў | 14 | | | 14 |
| **Раздзел IV. Рэстаўрацыя і кансервацыя твораў манументальнага і станковага жывапісу** | | | | |
| ***Тэма 24.*** Тэхналагічныя асаблівасці насценнага жывапісу | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 25.*** Рэстаўрацыя і кансервацыя твораў станковага жывапісу (тэмперны і алейны жывапіс) | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 26.*** Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў іканапісу | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 27.*** Захаванне, вывучэнне і рэстаўрацыя фрэскавага жывапісу | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 28.*** Захаванне, вывучэнне і рэстаўрацыя беларускага іканапісу | 2 | | 2 | |
| **Раздзел V. Захоўванне, кансервацыя і рэстаўрацыя музейных экспанатаў** | | | | |
| ***Тэма 29.*** Агульны рэжым захавання музейных экспанатаў. Музейная мэбля | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 30.*** Фондасховішчы і іх абсталяванне. Музейная экспазіцыя | 2 | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 31.*** Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя металічных вырабаў. Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 32.*** Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з керамікі, скуры і косці | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 33.*** Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя шкляных вырабаў | 2 | | 2 | |
| ***Тэма 34.*** Захаванне і кансервацыя скульптур | 2 | | | 2 |
| ***Тэма 35.*** Гісторыя развіцця і рэстаўрацыя старадаўняй мэблі | 2 | | | 2 |
| ***Тэма 36.*** Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. Археалагічнае дрэва. Археалагічны музей у Брэсце (старажытнае Бярэсце) | 2 | | 2 | |
| Разам ... | 120 | 40 | 16 | 64 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ КУРСА

### *Уводзіны*

Віды работ на матэрыяльных каштоўнасцях: нагляд, рамонт, натурныя даследаванні, кансервацыя, рэстаўрацыя, рэгенерацыя, рэканструкцыя, аднаўленне, прыстасаванне, раскрыццё.

### *Сістэма крытэрыяў каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры. Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь*

Асноўныя крытэрыі каштоўнасцей помнікаў гісторыі і культуры ў СССР: гістарычная, горадабудаўнічая, архітэктурна-эстэтычная, эмацыянальна-мастацкая, навукова-рэстаўрацыйная, функцыянальная каштоўнасці. Класіфікацыя каштоўнасцей у Рэспубліцы Беларусь. Крытэрыі адбору каштоўнасцей. Механізм уключэння музейных аб'ектаў і экспанатаў у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Зберажэнне і аднаўленне гісторыка-культурных каштоўнасцей.

## Раздзел I. Гісторыя еўрапейскай рэстаўрацыі

### *Тэма 1. Рэстаўрацыя помнікаў Еўропы XIX – пачатку XX ст. Фарміраванне прынцыпаў сучаснай рэстаўрацыі*

Першая спроба захавання помнікаў гісторыі і культуры ў Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме. Эдыкт Маёрыяна і указ караля Тэадорыха Вялікага (VI ст.н.э.). Булы рымскіх пап Паўла II і Сікста IV (XV ст.). Рэстаўрацыя абацтва Сен-Мексен у Францыі (канец XVII ст.). Указы Пятра I аб ахове і захаванні помнікаў гісторыі ў Расіі.

Дэкрэты Нацыянальнага канвента Францыі (канец XVIII ст.). Адкрыццё музея ў Луўры. Музей гісторыі архітэктуры Ленуара (1791 г.).

Спробы рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры ў эпоху рамантызму. Англія, Германія, Францыя. Віктор Гюго і яго раман “Сабор Парыжскай Божай Маці”.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць І.М.Карамзіна ў Расіі. Стварэнне Генеральнай інспекцыі аховы помнікаў у Францыі (1830 г.) і яе дзейнасць. Рэстаўрацыя Маскоўскага Крамля і лёс Кітай-горада ў Маскве.

Эпоха стылістычных рэканструкцый. Віале ле Дзюк – заснавальнік школы французскіх рэстаўратараў. Рэстаўрацыя сабора "Парыжскай Божай Маці". Аднаўленне замкаў у Каркасоне і П'ерфоне. Рэстаўрацыя сабора ў Руане архітэктарам Алавуанам.

### *Тэма 2. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў гісторыі і культуры ў СССР*

Нацыяналізацыя помнікаў гісторыі і культуры пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. Дэкрэт СНК ад 5 кастрычніка 1918 г. Стварэнне Расійскай акадэміі гісторыі матэрыяльнай культуры (1919 г.).

Рэстаўрацыя помнікаў Масквы: Крэмль, сабор Пакроваў на Рове, Кітай-горад, палаты князя Галіцына, Казанскі сабор на Чырвонай плошчы.

Стварэнне дзяржаўных рэстаўрацыйных майстэрань. Ігар Грабар – тэарэтык савецкай рэстаўрацыі. Пётр Бараноўскі і яго рэстаўрацыйная дзейнасць. Рэстаўрацыя помнікаў Сярэдняй Азіі. Закрыццё рэстаўрацыйных майстэрань. Сталінскія рэпрэсіі. Масавае знішчэнне культавых помнікаў архітэктуры. Страты СССР у галіне гісторыка-культурнай спадчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Дзейнасць Камісіі па ахове і аднаўленні помнікаў мастацтва. Стварэнне спецыяльных праектна-вытворчых рэстаўрацыйных майстэрняў у гістарычных гарадах СССР. Аднаўленне разбураных падчас вайны помнікаў Ленінграда і яго прыгарадаў. Рэстаўрацыя Пятніцкай царквы канца XII–пачатку XIII ст. у Чарнігаве. Аднаўленне помнікаў Ноўгарада і Пскова.

Чарговая "хваля" ваяўнічага атэізму ў эпоху Мікіты Хрушчова. Разбурэнне помнікаў культавай архітэктуры. Запрашэнне для аднаўлення помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны польскіх рэстаўратараў (старыя гарады Таліна і Рыгі).

Развіццё савецкай рэстаўрацыі ў 70–80 гг. XX ст. Стварэнне рэспубліканскіх добраахвотных таварыстваў па ахове пом-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікаў гісторыі і культуры. Змены ў савецкім заканадаўстве. Змены ў адносінах да культавых помнікаў у часы перабудовы. Стварэнне савецкага фонду культуры і часопіса “Наследие”.

### *Тэма 3. Рэстаўрацыя помнікаў Літвы*

Закон Літоўскай Рэспублікі “Аб ахове помнікаў культуры” ад 20 ліпеня 1940 г. і дзейнасць дзяржаўнай археалагічнай камісіі.

“Палажэнне аб ахове помнікаў культуры”, зацверджанае Саветам міністраў 14 кастрычніка 1948 г. “Інструкцыя аб парадку ўліку, рэгістрацыі, утрымання і рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры” (1949 г.). Адпаведная пастанова Савета міністраў ЛССР. Стварэнне навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрняў у 1950 г. і іх дзейнасць. Аднаўленне Тракайскага замка. Узнікненне Упраўлення рэстаўрацыі помнікаў (1969 г.) і Інстытута кансервацыі помнікаў (1970 г.). Дзейнасць рэстаўрацыйных майстэрняў у Каўнасе, Клайпедзе, Біржаі, Тракаі і Кедайняі.

Рэстаўрацыйны трэст рэстаўрацыі помнікаў культуры “Літрэстаўрацыя” (1975 г.) і яго структура. Рэстаўрацыя твораў мастацтва. Рэгенерацыя гістарычнага цэнтра Вільнюса.

Стварэнне музея народнага дойлідства. Уключэнне гістарычнага цэнтра Вільнюса (старой Вільні) у спіс сусветнай спадчыны (1994 г.). Аднаўленне Віленскага Арсенала і Ніжняга замка. Дзейнасць дэпартамента аховы культурных каштоўнасцей і Саюза рэстаўратараў Літвы. Мемарыяльны музей скульптур савецкага перыяду.

### *Тэма 4. Рэстаўрацыя помнікаў Польшчы*

Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры Рэчы Паспалітай у часы караля Станіслава Аўгуста. Першы польскі музей пачатку XIX ст. Кракаў – цэнтр падрыхтоўкі кадраў польскіх рэстаўратараў XIX ст. Пяць этапаў гісторыі польскай рэстаўрацыі. Грамадскія польскія арганізацыі, якія займаліся вывучэннем і захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны пачатку XX ст. Галіцыйская школа рэстаўратараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё кансервацыі і рэстаўрацыі ў аднаўленай Польскай дзяржаве (1918 – 1939 гг.). Страты Польшчы падчас Другой сусветнай вайны. Татальнае знішчэнне Варшавы ў 1944 годзе.

Дзейнасць польскіх рэстаўратараў у другой палове XX ст. Ваяводскія і гарадскія кансервацыйныя службы ў ПНР. Аднаўленне гістарычнага цэнтра Варшавы і каралеўскага замка. Стварэнне міжнароднай рэстаўрацыйнай структуры (PKZ). Дзейнасць польскіх рэстаўратараў за мяжой.

Адбудова гістарычных цэнтраў Гданьска, Кракава, Торуні, Познані і іншых старажытных гарадоў. Стварэнне музеяў народнага будаўніцтва пад адкрытым небам.

### *Тэма 5. Рэстаўрацыя помнікаў Польшчы і Літвы*

Тэарэтычныя распрацоўкі польскіх рэстаўратараў: "monument historyczny", "адаптацыя", "рэновацыя" і "рэвалорызацыя". Дзейнасць Уладзіслава Лушкевіча і Станіслава Тамковіча. Адбудова Вавельскага замка і Кракаўскага універсітэта. Адольф Шышка-Богуш – знакаміты польскі даследчык і рэстаўратар. Дзейнасць польскіх рэстаўратараў у Вільні і Віленскім краі. Аднаўленне касцёла Святой Ганны. Кансервацыя замкаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Праца польскіх рэстаўратараў у СССР і Беларусі. Адбудова Супрасльскага манастыра і абарончага храма XVI ст. – шэдэўра беларускай готыкі. Дзейнасць літоўскіх рэстаўратараў. Адбудова гістарычных цэнтраў старых гарадоў і мястэчак. Кансервацыя замкаў у Медніках (Мядзінінкай) і Каўнасе.

Рэстаўрацыя ансамбля Вільнюскага універсітэта. Вытворчасць рэстаўрацыйных будаўнічых матэрыялаў. Перыядычныя выданні польскіх і літоўскіх рэстаўратараў.

## Раздзел II. Гісторыя беларускай рэстаўрацыі і аховы помнікаў

### *Тэма 6. Ахова і рэстаўрацыя помнікаў Беларусі ў XVI – пачатку XX ст.*

Беларуска-літоўскія летапісы як крыніцы па вывучэнні помнікаў архітэктуры Беларусі. Дзейнасць Ігната Кульчын-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага ў Гродне. Інвентар Гродзенскага Каложскага манастыра (1738 г.). Выкладанне архітэктуры ў езуіцкіх калегіумах, падрыхтоўка прафесійных архітэктурных кадраў. Роля Вільнюскага універсітэта ў вывучэнні помнікаў гісторыі і мастацтва. Уладзіслаў Сыракомля і яго "Падарожжа па маіх былых ваколіцах". Перабудова Спаса-Праабражэнскай царквы Ефрасіннеўскага манастыра ў Полацку (1832 г.).

Дзейнасць Напалеона Орды ў Беларусі і яго замалёўкі помнікаў архітэктуры. Указы Мікалая І 1826 і 1848 гг. аб вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі і архітэктуры. Імператарскі загад 1877 г. аб забароне перабудовы старых будынкаў без дазволу археалагічных таварыстваў. Роля указа ад 11 сакавіка 1889 г.

Дзейнасць Пятра Пакрышкіна ў Беларусі. Спроба адбудовы Каложскай царквы ў канцы XIX – пачатку XX ст. Вывучэнне і рамонт Полацкай Сафіі, Лідскага замка і Камянецкай вежы. Страты падчас Першай сусветнай вайны.

### *Тэма 7. Рэстаўрацыя і ахова помнікаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.)*

Польскае заканадаўства і структура кансервацыйных установаў у краіне. Вяртанне храмаў каталіцкай царкве.

Дзейнасць Яна Клоса, Язэпа Драздовіча і Язэпа Ядкоўскага. Кансервацыя беларускіх замкаў. Рэстаўрацыя замка ў Міры. Аднаўленне касцёла XVI ст. у в. Гнезна Ваўкавыскага раёна. Роля рэстаўрацыйных зборнікаў "Ахова помнікаў" (1931, 1932 гг.). Беларускі музей імя Івана Луцкевіча ў Вільні і яго калекцыі.

Археалагічныя раскопкі ў Гродне. Адкрыццё Верхняй і Ніжняй царквы і рэштак княжацкага палаца XII ст. на тэрыторыі Старога замка. Вывучэнне Каложскай (Барысаглебскай) царквы. Аднаўленне дзейнасці Віленскага універсітэта і яго роля ў вывучэнні гісторыка-культурнай спадчыны.

### *Тэма 8. Ахова помнікаў у Беларусі ў XX ст. (пасля 1917 г.)*

Адметная асаблівасць заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры першых гадоў савецкай улады. Пастанова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

урада БССР ад 30 студзеня 1919 г. Першыя дзяржаўныя органы па ўліку і ахове помнікаў.

Сумеснае цыркулярнае распараджэнне Наркампроса, Наркамзема і Наркамата ўнутраных спраў БССР ад 31 жніўня 1924 г. "Аб парадку прымянення пастановы Саўнаркама БССР ад 24 снежня 1923 года аб рэгістрацыі, прыёме на ўлік і ахове помнікаў мастацтва, старажытнасцей, побыту і мясцовай прыроды, якія знаходзяцца ва ўласнасці ўстаноў і грамадстваў, а таксама прыватных асоб".

Канцэнтрацыя і захаванне культурных каштоўнасцей у музейных фондах. Пастанова ЦВК і СНК БССР ад 6 снежня 1924 г. Асноўныя прынцыпы ахоўнай дзейнасці дзяржавы: забарона вывазу помнікаў старажытнасцей за мяжу, прыняцце мер па папярэджанні разбурэнняў помнікаў і інш. Пастанова СНК ад 5 ліпеня 1926 г. "Аб парадку аховы помнікаў старажытнасцяў, мастацтва, побыту і прыроды, аб'яўленых дзяржаўным дастаяннем".

Сістэма аховы, уліку і выкарыстання гісторыка-культурнай спадчыны і рэгулявання яе агульнасаюзным заканадаўствам. Пастанова Савета міністраў СССР ад 14 кастрычніка 1948 г. "Аб мерах па паляпшэнні аховы помнікаў культуры".

Закон БССР ад 26 снежня 1969 г. "Аб ахове помнікаў культуры". Рэгламентацыя парадку правядзення рамонтна-рэстаўрацыйных работ, зацвярджэнне ўзораў дакументаў (ахоўна-арэндная дамова на карыстанне нерухомым помнікам гісторыі і культуры; уліковая картачка помніка, пашпарт помніка).

Пастанова Савета міністраў БССР ад 1 кастрычніка 1984 г. "Аб фактах грубых парушэнняў заканадаўства аб ахове помнікаў гісторыі і культуры". Рэкамендацыі аб забеспячэнні выканкамаў мясцовых Саветаў дэпутатаў Зводам помнікаў гісторыі і культуры.

Новы перыяд у галіне аховы культурнай спадчыны краіны. Важнейшыя нарматыўна-прававыя акты аб ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей. Закон "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 9. Вывучэнне, кансервацыя і рэстаўрацыя помнікаў гісторыі і культуры ў БССР*

Роля Інстытута беларускай культуры і часопіса “Наш край” у вывучэнні і ахове помнікаў гісторыі. Дзейнасць І.Хозерава і М.Шчакаціхіна. Краязнаўчы рух у БССР і яго заняпад. Знішчэнне і перабудова помнікаў архітэктуры ў 30-я гг. ХХ ст. на тэрыторыі БССР. Страты падчас Другой сусветнай вайны. Праблема вяртання помнікаў гісторыі і культуры.

Вывучэнне помнікаў гісторыі і культуры ў канцы 40-х – пачатку 50-х гг. Дзейнасць Івана Хозерава і Пятра Бараноўскага. Раскопкі помнікаў архітэктуры XII–XIII стст. Стварэнне археалагічнага музея “Бярэсце”. Хрушчоўскі валюнтарызм у Беларусі і яго наступствы. Стварэнне СНРВМ МК БССР (1968–1969 гг.) Аднаўленне капліцы-спачывальні Паскевічаў у Гомелі і Праабражэнскай царквы ў Заслаўі. Рэстаўрацыя Полацкай Сафіі. Дзейнасць архітэктараў-рэстаўратараў Валерыя Слюнчанкі і Сяргея Багласава.

Рэканструкцыя Траецкага прадмесця ў Мінску (1980 г.). Ажыццяўленне прынцыпу “рэваларызацыі”. Рэстаўрацыя станковага і фрэскавага жывапісу, старажытнай скульптуры і разьбы. Беларускі навукова-даследчы рэстаўрацыйны інстытут “Белспецпраектрэстаўрацыя” і яго дзейнасць. Стварэнне мемарыяла Брэсцкая крэпасць.

Рэстаўрацыя ў часы незалежнай беларускай краіны. Аднаўленне беларускіх ратуш. Вяртанне храмаў вернікам і праблемы іх рэстаўрацыі. Рэстаўрацыя і музеефікацыя беларускіх замкаў.

Прапановы Міністэрства культуры па ўключэнні найбольш унікальных помнікаў Беларусі ў Сусветны спіс культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА. Міжнародны дзень помнікаў і мясцін і яго святкаванне ў Беларусі (18 красавіка).

## *Тэма 10. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Віцебшчыны (Віцебск, Полацк, Орша)*

Віцебская Дабравешчанская царква XII ст. і яе лёс. Спроба знішчэння помніка, кампанія пратэсту і кансервацыя руін. Аднаўленне помніка ў 1998 г. Праблема адбудовы Свята-Успенскага сабора. Рэстаўрацыя Віцебскай ратушы, музея-

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ

сядзібы Ільі Рэпіна ў Здраўнёва, дома-музея Марка Шагала і касцёла Святой Варвары.

Аднаўленне помнікаў архітэктуры і гісторыі Полацка. Полацкі Сафійскі сабор, яго археалагічнае вывучэнне, рэстаўрацыя і прыстасаванне. Адраджэнне Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра і Богаяўленскага сабора XVIII ст. Богаяўленскі мужчынскі манастыр і яго прыстасаванне пад музей беларускага кнігадрукавання. Вывучэнне і рэстаўрацыя Куцеінскага Богаяўленскага манастыра XVII ст. і царквы Святога Духа ў Оршы. Аднаўленне былога вадзяного млына.

### *Тэма 11. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Магілёўшчыны (Магілёў, Мсціслаў, Быхаў)*

Разбурэнне гістарычнага цэнтра Магілёва ў XX ст. Вывучэнне і праект адбудовы Магілёўскай ратушы. Вяртанне вернікам і аднаўленне інтэр’ераў карметіцкага касцёла Святога Станіслава. Дом-музей В.К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве. Прыстасаванне будынка былога банка пад абласны мастацкі музей. Вывучэнне і аднаўленне Нікольскага манастыра XVII–XVIII стст.

Вывучэнне і спробы аднаўлення гістарычнай спадчыны г. Мсціслава: царква А.Неўскага, кармеліцкі касцёл, гандлёвыя рады, былы езуіцкі касцёл XVIII ст., будынак гімназіі. Праблемы захавання ансамбля Пустынскага манастыра.

Замак Сапегаў у Быхаве. Абарончая сінагога XVII ст. Праблема іх аднаўлення і прыстасавання.

### *Тэма 12. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі беларускіх замкаў (Мірскі, Крэўскі, Нясвіжскі, Навагрудскі і Лідскі)*

Архітэктурна-археалагічнае вывучэнне Мірскага замка. Праблемы яго аднаўлення і прыстасавання. Рэстаўрацыя замка ў 20–30-я гг. XX ст. Наданне замку статуса помніка сусветнай спадчыны. Лёс Мірскай капліцы пачатку XX ст. і касцёла ў Міры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыя будаўніцтва і рэстаўрацыі палацава-паркавага ансамбля ў Нясвіжы. Дзейнасць Антона Радзівіла і яго жонкі. Адбудова Нясвіжскай ратушы.

Трагічны лёс Крэўскага замка ў Першую сусветную вайну. Кансервацыя польскімі спецыялістамі. Археалагічнае вывучэнне і спроба кансервацыі ў канцы XX ст. Рух моладзі ў абарону Крэўскага замка.

Замак-кастэль у Лідзе. Гісторыя вывучэння. Рэстаўрацыя-рамонт у пачатку XX ст., дзейнасць польскіх рэстаўратараў. Праект кансервацыі, рэстаўрацыі і прыстасавання Лідскага замка ў 80-х гг. XX ст. Сучасныя праблемы аднаўлення і прыстасавання.

### *Тэма 13. Праблемы кансервацыі і рэстаўрацыі помнікаў гісторыі і культуры Мінска*

Планіроўка сярэдневяковага Мінска ў XV–XIX стст. Узнікненне Верхняга горада, Траецкага і Ракаўскага прадмесцяў. Археалагічнае вывучэнне і знішчэнне Мінскага замчышча. Кальварыйскі гісторыка-культурны комплекс. Рэгенерацыя Траецкага прадмесця. Вяртанне вернікам храмаў і іх адбудова. Аднаўленне касцёлаў Святога Роха, Святых Сымона і Алены і цэркваў Пятра і Паўла і Святой Марыі Магдалены. Адбудова помнікаў савецкага перыяду. Лошыцкі парк і сядзіба. Праблемы іх рэканструкцыі і прыстасавання.

### *Тэма 14. Рэканструкцыя і рэстаўрацыя Верхняга горада Мінска*

Узнікненне Верхняга горада як архітэктурнага ансамбля ў XVI–XVIII стст. Плошча Свабоды і яе забудова. Разбурэнне помнікаў архітэктуры і іх перабудова ў 30-я і 50–60-х гг. XX ст. Знішчэнне забудовы вуліцы Нямігі і Мінскага замчышча. Праект поўнага знішчэння Верхняга горада ў 70-х гг. мінулага стагоддзя. Змаганне беларускай інтэлігенцыі за яго захаванне.

Аднаўленне помнікаў Верхняга горада ў пачатку 90-х гадоў. Дзейнасць акцыянернага таварыства “Стары Менск”. Адбудова і прыстасаванне кляштара базіліянак, дома масонаў, сядзібы Ваньковічаў, гандлёвых радоў і Мінскай рату-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

шы. Праблема аднаўлення Свята-Духаўскай царквы XVII ст. Аднаўленне польскімі рэстаўратарамі былога езуіцкага касцёла XVIII ст. Рэканструкцыя жылой забудовы і знос асобных будынкаў (вуліцы Герцэна, Гандлёвая, Рэвалюцыйная і Кірылы і Мяфодзія).

### *Тэма 15. Аналіз публікацый па захаванні гістарычнай спадчыны старога Мінска і іншых гістарычных гарадоў Беларусі*

Студэнты робяць аналіз адпаведных артыкулаў па старонках газет ("Звязда", "Культура", "Краязнаўчая газета", "Наша слова", "Літаратура і Мастацтва" і інш.) і часопісаў ("Спадчына", "Беларускі гістарычны часопіс", "Беларуская мінуўшчына", "Помнікі гісторыі і культуры Беларусі" і інш.).

## Раздзел III. Тэорыя і практыка сучаснай рэстаўрацыі

### *Тэма 16. Асноўныя прынцыпы сучаснай рэстаўрацыі*

Гісторыя рэстаўрацыйнай тэрміналогіі ў XX ст. Вызначэнне тэрмінаў "помнік", "гістарычны помнік", "архітэктурны помнік", "помнікі старажытнасці і мастацтва", "помнікі гісторыі і культуры", "мемарыяльны помнік". Пазнавальная і эмацыянальная каштоўнасць помніка гісторыі. Паціна часу і адносіны да яе рэстаўратараў.

Кантэкст архітэктурнага і прыроднага наваколля помніка. Ахоўныя зоны. Сігнацыя ў сучаснай рэстаўрацыі. Асноўныя віды работ на помніках архітэктуры. Інжынерная рэстаўрацыя. Кансервацыя руін. Праблемы і перспектывы рэстаўрацыі ў Беларусі. Адаптацыя помнікаў у гарадскім асяроддзі. Канцэпцыя рэстаўрацыі і адаптацыі архітэктурнай і гістарычнай спадчыны Беларусі.

### *Тэма 17. Прынцыпы рэстаўрацыі руінных помнікаў архітэктуры*

Прынцыпы рэстаўрацыі руінных помнікаў. Метад анастылозу. Рэстаўрацыя храма Веспасіяна ў Рыме архітэктарам Валадзье (1810–1813 гг.). Раскопкі і рэстаўрацыя помнікаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рымскага часу ў Пампеі. Рэстаўрацыя помнікаў антычнасці ў Грэцыі. Аднаўленне славутага Парфенона. Дзейнасць Міколы Баланаса (канец XIX – пач. XX ст.) і яго “археалагічны” метад рэстаўрацыі.

Кангрэс археолагаў і рэстаўратараў у Афінах (1931 г.) і яго вынікі. Ужыванне метаду анастылозу ў Расійскай імперыі. Аднаўленне царквы Святога Васілія ў Оўручы архітэктарам А.Шчусевым. Раскопкі храма П.Пакрышкіным (1907–1908 гг.). Асноўныя метадычныя прыёмы рэстаўрацыі царквы Святога Васілія ў Оўручы.

### *Тэма 18. Даследаванні помнікаў архітэктуры падчас рэстаўрацыі. Асноўныя патрабаванні да навуковага праекта рэстаўрацыі*

Натурныя даследаванні: выкананне зандажоў, археалагічныя і геалагічныя даследаванні. Аб’екты кансервацыі. Правядзенне навуковых даследаванняў. Віды кансервацыі. Кансервацыя руін. Рэстаўрацыя і яе мэтазгоднасць. Методыка рэстаўрацыйных работ. Даследаванне помніка. Фіксацыя помніка: абмерная, фатаграфічная, фотаграмметрычная, малюнachная з расфарбоўкай, пісьмовая. Тэхнічнае абгрунтаванне праекта рэстаўрацыі і прыстасаванне помніка.

Эскізны праект як першая стадыя рэстаўрацыйнага праектавання. Правядзенне даследчых работ па вызначэнні межаў гістарычных цэнтраў гарадоў. Выкананне гістарычных даследаванняў, інвентарызацыі і пашпартызацыі гістарычнай забудовы, гісторыка-апорных планаў, зон аховы ў гістарычных гарадах.

Прававая паслядоўнасць арганізацыі навукова-даследчых, праектных і рэстаўрацыйных работ на помніках. Сістэма атрымання і выдачы адпаведнай зыходна-дазваляючай дакументацыі, яе структура. Сертыфікаты на правядзенне работ на матэрыяльных каштоўнасцях.

Навуковае кіраўніцтва і прававая роля навуковага кіраўніка ў арганізацыі і правядзенні навуковых, праектных і вытворчых работ па рэстаўрацыі. Адказнасць навуковага кіраўніка за захаванне адметных якасцей і унікальных фрагментаў гісторыка-культурных каштоўнасцей. Роля аўтарскага нагляду ў дасягненні якасці рэстаўрацыйна-вытворчых работ. Выз-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

начэнне чарговасці фінансавання работ па захаванні і аднаўленні матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей.

### *Тэма 19. Міжнародныя арганізацыі па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры*

Гісторыя ўзнікнення і развіцця ЮНЕСКА і яе структура. Уваходжанне ў склад ЮНЕСКА СССР і БССР. Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА ў БССР і Рэспубліцы Беларусь. Штомесячнік "Кур'ер ЮНЕСКА" і яго роля ў прапагандзе сусветнай спадчыны. Канвенцыя аб ахове сусветнай, культурнай і прыроднай спадчыны (1972 г.). Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і ЮНЕСКА (1999 г.). Удзел Беларусі ў працы Фонда сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны.

Сусветная дэкларацыя культурнай разнастайнасці ЮНЕСКА (2001 г.) Еўрапейскія Дні спадчыны. Міжнародны дзень помнікаў і мясцін 18 красавіка. Узнікненне і дзейнасць Міжнароднага савета помнікаў і мясцін (ICOMOS) і яго структура. Міжнародны цэнтр дакументацыі ў Парыжы. Венецыянская хартыя і іншыя міжнародныя пагадненні ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў. Міжнародны савет музеяў (ICOM) і яго дзейнасць. Узнікненне Беларускага камітэта ICOM.

### *Тэма 20. Праблемы рэстытуцыі культурных каштоўнасцей. Помнікі гісторыі і культуры Беларусі ў музеях іншых краін*

Вызначэнне тэрміна "рэстытуцыя" ў грамадзянскім і міжнародным праве. Вытокі рэстытуцыі ў XIX ст. Развіццё рэстытуцыі пасля Першай сусветнай вайны. Дамова Польшчы з Расіяй і Украінай аб вяртанні культурных каштоўнасцей (Рыга, сакавік 1921 г.) і яе вынікі для Беларусі. Пакт Мікалая Рэрыха (15 красавіка 1935 г.).

Дзейнасць фашысцкай Германіі і яе саюзнікаў па захопу і экспрапрыяцыі культурных каштоўнасцей падчас Другой сусветнай вайны. Дамова 1944 г. паміж ПНР і БССР аб вывазе культурных каштоўнасцей прыватнымі асобамі. Ліквідацыя беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні і яго лёс. Вяр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

танне культурных каштоўнасцей беларускага народа пасля Другой сусветнай вайны. Знікненне і пошукі крыжа Ефрасінні Полацкай. Канвенцыя аб ахове сусветнай, культурнай і прыроднай спадчыны 1972 г.

Рэкамендацыя ЮНЕСКА аб міжнародным абмене культурнымі каштоўнасцямі (1976 г.) Праблема рэстытуцыі культурных каштоўнасцей пасля распаду СССР. Пазіцыя Расіі па гэтаму пытанню. Дзейнасць Беларускага фонду культуры і Нацыянальнага навукова-асветніцкага цэнтра імя Ф.Скарыны. Зборнікі "Вяртанне" і іх роля. Стварэнне міжведамаснай рабочай групы па рэстаўрацыі культурных каштоўнасцей у Беларусі (2006 г.).

### *Тэма 21. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў народнага дойлідства*

Захаванне помнікаў драўлянага дойлідства. Узнікненне музеяў пад адкрытым небам у Заходняй Еўропе і СССР. Музей-запаведнік на востраве Кіжы (Паўночная Расія). Стварэнне беларускага музея-скансэна. Праблема захавання драўляных помнікаў архітэктуры ў вялікіх гарадах. Гродзенскі лямус XVII ст. Культавае драўлянае дойлідства Беларусі, праблемы захавання і рэстаўрацыі. Рэшткі драўляных будынкаў, знойдзеныя пры археалагічных раскопках, іх кансервацыя і захаванне. Сушка археалагічнага дрэва ў камеральных умовах.

### *Тэма 22. Захаванне, вывучэнне і рэстаўрацыя помнікаў народнай архітэктуры*

Дасведчанасць беларускіх рэстаўратараў пры аднаўленні мемарыяльных мясцін, звязаных з жыццём і дзейнасцю Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча і Адама Міцкевіча. Праблема пераносу драўляных помнікаў архітэктуры. Аднаўленне сядзібы Ільі Рэпіна ў Здраўнёве пад Віцебскам. Праблема захавання гістарычных беларускіх мястэчкаў і сёл і іх драўлянай забудовы.

Вызначэнне галоўных кірункаў абароны драўляных пабудоў: абарона ад біялагічнага разбурэння, ад магчымасці ўзгарання, умацаванне хімічнымі сродкамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Спосабы апрацоўкі і прапіткі драўніны. Абарона помнікаў народнага дойлідства ад уздзеянняў знешняга асяроддзя. Правілы эксплуатацыі драўляных будынкаў – музейных аб’ектаў.

### *Тэма 23. Рэстаўрацыя мемарыяльных садоў і паркаў*

Праблема рэстаўрацыі і прыстасавання помнікаў сядзібна-паркавай архітэктуры. Неабходныя ландшафтныя працы: добраўпарадкаванне і пасадка новых зялёных насаджэнняў.

Плён супрацоўніцтва архітэктараў-рэстаўратараў і садоўнікаў-дэкаратараў. Рэстаўрацыйныя работы на сядзібах і парках у Гомелі, Жылічах, Снове, Хальчы і Свяцку. Аднаўленне гістарычных паркаў у Нясвіжы і Міры. Праблема аднаўлення Лошыцкага парку ў Мінску. Захаванне гарадскіх сквераў і бульвараў. Аднаўленне садова-паркавай скульптуры і малых архітэктурных формаў. Мемарыяльныя сядзібы, ператвораныя ў музеі (Завоссе і Залессе).

## Раздзел IV. Рэстаўрацыя і кансервацыя твораў манументальнага і станковага жывапісу

### *Тэма 24. Тэхналагічныя асаблівасці насценнага жывапісу*

Асновы тэхналогіі насценнага жывапісу. Віды фрэсак: а фрэска, а сэка і казеінава-вапнавы жывапіс. Аснова насценнага жывапісу. Грунт насценнага жывапісу як шматкампанентная структура. Тэхніка выканання малюнка пад жывапіс у тэхніцы фрэскі. Граф’я. Пігменты. Звязачнае рэчыва.

Рэстаўрацыя фрэсак. Складанасці рэстаўрацыі помнікаў архітэктуры і мастацтва ў Беларусі: шматразовыя разбурэнні, перабудовы і наслаенні розных эпох і стыляў, асаблівасці ўздзеяння кліматычных умоў, недаўгавечнасць іх асноўных матэрыялаў.

Рэстаўрацыя фрэсак Полацкага Сафійскага сабора XI ст. і Спаса-Праабражэнскай царквы Ефрасіннеўскага манастыра XII ст.

Рэстаўрацыя фрэсак XV–XVI стст. Вывучэнне фрагментаў фрэсак Крэўскага замка XV ст. Супрасльскі храм XVI ст. і яго лёс.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Рэстаўрацыя фрэсак XVII–XVIII стст. на прыкладзе кармеліцкіх касцёлаў у Магілёве і Мсціславе. Выратаванне насценнага жывапісу XVIII ст. бялыніцкага касцёла. Аднаўленне насценнага жывапісу Петрапаўлаўскага сабора і былога езуіцкага касцёла ў Мінску. Рэстаўрацыя насценнага жывапісу ў касцёле Святых Сымона і Алены ў Мінску.

Гісторыя вывучэння беларускіх фрэсак у XX ст. Стварэнне нацыянальнай школы беларускіх рэстаўратараў жывапісу. Дзейнасць секцыі рэстаўратараў у складзе Саюза мастакоў Беларусі.

### *Тэма 25. Рэстаўрацыя і кансервацыя твораў станковага жывапісу (тэмперны і алейны жывапіс)*

Выкарыстанне аптычных, хімічных і фізічных метадаў даследавання. Вывучэнне тэхнікі тэмпернага жывапісу: фарбы, расцёртыя на яечным жаўтку, і тэмпера на цэльным яйку. Жаўткова-алейны жывапіс. Аснова. Грунт. Традыцыйныя методыкі кансервацыі і рэстаўрацыі тэмпернага жывапісу. Замацаванне структуры помніка. Выпраўленне дэфармаваных частак. Аднаўленне і выдаленне хімічна змяніўшыхся элементаў. Выдаленне больш позніх напластаванняў.

Кансервацыя як сродак па захаванні вобліка і трываласці помніка. Захаванне помнікаў у музеях. Забеспячэнне аптымальных умоў захавання ў музеях твораў станковага жывапісу (тэмпературна-вільготнасны, біялагічны, светавы рэжымы).

Пашкоджанне карцін і іх фіксацыя. Асноўныя віды пашкоджанняў: зацёкі, пакарабачанні, выцягнутасць, змятасці і зломы. Забруджванне адваротнага боку палатна. Пашкоджанні грунта і фарбавага слоя. Уздуцці і запісы. Роля пакрывальнага лаку. Пашкоджанні лакавага слоя. Прафілактычныя агляды твораў жывапісу захавальнікамі калекцый.

### *Тэма 26. Рэстаўрацыя і кансервацыя помнікаў іканапісу*

Вывучэнне аб’екта рэстаўрацыі пры дапамозе аптычных, хімічных і фізічных метадаў даследавання. Вывучэнне тэхналогіі стварэння абразоў (спектральны, хроматаграфічны, мікракрышталічны і іншыя аналізы, рэнтгенаграфія, мікра- і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

макрафатаграфія, даследаванне ў інфрачырвоных промнях). Выяўленне першаснага размяшчэння абраза (царква, жылое памяшканне, гарышчы і інш.), біялагічных і механічных пашкоджанняў. Дэфектныя акты. Каранцін.

### *Тэма 27. Захаванне, вывучэнне і рэстаўрацыя фрэскавага жывапісу*

Вывучэнне прычын і відаў разбурэння фрэсак: біялагічнае пашкоджанне, тэмпературна-вільготнасны рэжым, прычыны дэструкцыі і вымывання мінеральнага вяжучага, уплыў руху паветра ў памяшканні і інш. Віды зруйнавання фрэсак: разрыхленне і адслаенне фрагментаў фарбавага слоя, распыленне пігменту і інш. Аптымальныя параметры тэмпературы і вільготнасці для насценнага жывапісу.

Умацаванне і аднаўленне разбураных, пашкоджаных або скажоных помнікаў. Дакументальнае даследаванне помніка (апісанне, фотафіксацыя, абмерныя чарцяжы, археалагічнае, гістарычнае, інжынерна-тэхнічнае). Аднаўленне і расчыстка пазнейшых напластаванняў як мэта рэстаўрацыі твораў выяўленчага мастацтва. Метады і спосабы рэстаўрацыі фрэсак.

### *Тэма 28. Кансервацыя, вывучэнне і рэстаўрацыя беларускага іканапісу*

Абразы як шматкампанентная структура: аснова, грунт, фарбавы і засцерагальны слаі. Рэстаўрацыя абразоў. Выпраўленне механічных пашкоджанняў. Прафілактычная заклейка. Тэхналогія ўмацавання ляўкасу і фарбавага слоя. Асноўныя спосабы замацавання ляўкасу. Выдаленне запісаў, пацямнеўшай аліфы. Аднаўленне абразоў. Метад уразання.

Задачы і роля рэстаўратара ў захаванні абразоў у экспазіцыйнай прасторы і музейных фондах. Аптымальны рэжым захавання абразоў у музеях: тэмпературна-вільготнасны, біялагічны, светавы. Дзейнасць беларускіх рэстаўратараў А.Шпунта, П.Журбея і А.Ліпскага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел V. Захоўванне, кансервацыя і рэстаўрацыя музейных экспанатаў

### *Тэма 29. Агульны рэжым захавання музейных экспанатаў. Музейная мэбля*

Асноўныя віды музейных будынкаў. Прыстасаваныя будынкі. Патрабаванні да асвятлення (дзённага і штучнага). Супрацьпажарная бяспека. Сістэма ацяплення і вентыляцыі. Сістэма аховы музейных экспанатаў розных катэгорый. Змаганне з біялагічнымі шкоднікамі і хімічным забруджваннем паветра. Асноўныя тыпы музейнай мэблі. Музейныя вітрыны. Галоўныя патрабаванні да музейнай мэблі.

### *Тэма 30. Фондасховішчы і іх абсталяванне. Музейная экспазіцыя*

Асноўныя патрабаванні да фондасховішчаў. Асвятленне, вентыляцыя, ацяпленне, сігналізацыя, каналізацыя і сістэма аховы. Супрацьпажарныя сродкі і іх месцазнаходжанне. Музейная мэбля ў фондасховішчах. Камера дэзінфекцыі. Рэстаўрацыйныя майстэрні ў музеях і іх праблемы. Сталая і часовая музейная экспазіцыя. Падрыхтоўка музейных экспанатаў да паказу. Роля спецыялістаў-рэстаўратараў. Музейныя экспазіцыі ў ацяпляльных і халодных памяшканнях. Музейныя экспазіцыі пад адкрытым небам.

### *Тэма 31. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя металічных вырабаў. Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне*

Рэстаўрацыя металічных вырабаў. Механічны, хімічны і электрахімічны спосабы. Нумізматычныя калекцыі і іх захаванне. Расчыстка манет, знойдзеных падчас археалагічных раскопак. Захаванне вырабаў з каштоўных металаў. Вырабы з волава. “Алавяная чума”. Свінцовыя вырабы і іх захаванне. Медныя і бронзавыя вырабы. Віды паціны. Іржа на жалезных вырабах. Вырабы з жалеза ў музейных экспазіцыях. Спосабы прафілактыкі. “Гарматнае сала”. Чыстка паліраваных, варанёных і інкруставаных вырабаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 32. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з керамікі, скуры і косці*

Археалагічная кераміка. Апрацоўка і захаванне ляпной керамікі эпохі неаліта, бронзы і жалезнага веку. Рэстаўрацыя ганчарнай керамікі. Дагіпсоўка і таніраванне. Музейныя муляжы. Рэстаўрацыя кафлі і кафляных печаў. Будаўнічая кераміка. Вырабы са скуры, знойдзеныя падчас археалагічных раскопак. Іх апрацоўка і захаванне. Вырабы са скуры і футра ў музейных экспазіцыях і фондах. Археалагічныя знаходкі вырабаў з косці. Іх апрацоўка і кансервацыя. Рэстаўрацыя вырабаў з косці. Антрапалагічныя калекцыі ў музеях.

### *Тэма 33. Захаванне, кансервацыя і рэстаўрацыя шкляных вырабаў*

З'яўленне шкляных вырабаў у Беларусі ў эпоху бронзы і жалезнага веку. Антычнае і ўсходняе шкло. Візантыйскае шкло ў Беларусі. З'яўленне шклаpобаў у Беларусі. Беларускае гутнае шкло. Археалагічнае шкло. Ірызацыя археалагічнага шкла. Вырабы з каляровых эмалей і іх захаванне. Венецыянскае і багемскае шкло ў Беларусі. Ювелірныя вырабы са шкла. Люстэркі і жырандолі. Рэканструкцыя шкляных вырабаў.

### *Тэма 34. Захаванне і кансервацыя скульптур*

Каменная скульптура ў Беларусі. Дахрысціянская скульптура. Каменная скульптура эпохі Рэнесанса і барока. Захаванне каменнай скульптуры пад адкрытым небам. Змаганне з біялагічнымі шкоднікамі і хімічным забруджваннем паветра.

Гіпсавая і стукавая скульптура ў інтэр'ерах беларускіх храмаў. Драўляная скульптура XVI–XVIII стст. Уніяцкая драўляная паліхромная скульптура, яе вывучэнне, захаванне і рэстаўрацыя. Школа беларускіх рэстаўратараў. Драўляная рэльефная разьба з пазалотай. Аднаўленне іканастасаў XVII–XIX стст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 35. Гісторыя развіцця і рэстаўрацыя старадаўняй мэблі*

Першая мэбля ў жытле старажытнага чалавека. З'яўленне стала ў бронзавым веку. Егіпецкая і антычная мэбля. Візантыйская мэбля. Культавая і свецкая мэбля XI–XIII стст. Гатычная мэбля. Італьянская мэбля эпохі Рэнесанса. Французская мэбля эпохі барока, ракако і класіцызму.

Сыравіна для вырабу старажытнай мэблі. З'яўленне чырвонага дрэва. Інкрустацыя мэблі, выкарыстанне металу, каменя і косці. Абіўка мэблі тканінай. Венская мэбля. Беларуская сялянская мэбля XIX–XX стст. і яе захаванне. Спосабы рэстаўрацыі мэблі. Змаганне з біялагічнымі шкоднікамі.

## *Тэма 36. Захаванне і кансервацыя вырабаў з дрэва. Археалагічнае дрэва. Археалагічны музей у Брэсце (старажытнае Бярэсце)*

Рэстаўрацыя вырабаў з дрэва. Археалагічнае дрэва. Метад кансервацыі археалагічнага дрэва. Методыка прафесара Віхрова. Этнаграфічныя экспанаты з дрэва і іх захаванне. Змаганне з біялагічнымі шкоднікамі. Гісторыя стварэння археалагічнага музея ў Брэсце.

Кансервацыя і рэстаўрацыя вырабаў з бяросты. Берасцяныя граматы і іншыя вырабы з бяросты. Метад дэндрахраналогіі для датавання старажытнага дрэва. Захаванне гербарыяў у музейных фондах і экспазіцыях. Захаванне і рэстаўрацыя вырабаў з паперы і кардону.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1. *Алексеев, Л.В.* Археология и краеведение Беларуси XVI – 30-я гг. XX в. / Л.В.Алексеев. – Мн.: Беларуская навука, 1996. – 206 с.

2. *Багласаў, С.Г.* Праблемы аднаўлення страчаных форм і функцый помнікаў архітэктуры Беларусі пры іх рэстаўрацыі / С.Г. Багласаў // Помнікі старажытнай беларускай культуры. Новыя адкрыцці. – Мн.: Навука і тэхніка, 1984. – С. 126 –132.

3. *Багласов, С.Г.* Верхний город Минска: проблемы реконструкции / С.Г.Багласов // Строительство и архитектура Беларуси. – 1982. – № 2. – С. 24 – 27.

4. *Беларуская* кафля / А.А.Трусаў [і інш.]; пад рэд. С.А.Мілючэнкава. – Мн.: Беларусь, 1989. – 150 с.

5. *Гліннік, В.В.* Неабходнасць стратэгіі захавання архітэктурнай спадчыны Беларусі савецкага перыяду / В.В.Гліннік // Праблемы захавання архітэктурнай спадчыны савецкага перыяду. Каштоўнасці мінуўшчыны – 6. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 45 – 57.

6. *Дубянецкі, Э.* Сусветная культура. Ад старажытнасці да нашых дзён / Э. Дубянецкі. – Мн.: БелЭн, 2001. – 240 с.

7. *Дучыц, Л.У.* Археалагічныя помнікі ў назвах, вераваннях і паданнях беларусаў / Л.У.Дучыц. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 59 с.

8. *Исследование* и реставрация русских изразцовых печей XVII – XVIII веков / А.И.Немцова // Методические рекомендации. – М.: Наука, 1989. – 35 с.

9. *История* и теория реставрации памятников архитектуры: сб. научн. трудов / под ред. А.С.Щепкова. – М. : Наука, 1986. – 98 с.

10. *Калнін, В.В.* Мірскі замак / В.В.Калнін. – Мн.: Беларусь, 2002. – 160 с.

11. *Лабачэўская, В.А.* Зберагаючы самабытнасць. З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В.А.Лабачэўская. – Мн.: Навука і тэхніка, 1998. – 420 с.

12. *Лакотка, А.П.* Пра што раскажуць прадмесці / А.П.Лакотка // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 5. – С. 44 – 49.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*13. Мартыненко, И.Э.* Законодательство об охране историко-культурного наследия и прокурорский надзор за его исполнением / И.Э. Мартыненко. – Мн.: Тесей, 2001. – 245 с.

*14. Михайловский, Е.В.* Реставрация памятников архитектуры / Е.В.Михайловский. – М.: Наука, 1971. – 189 с.

*15. Памятники* всемирного наследия / В.П.Кисель [и др.]. – Мн.: БелЭн, 1998. – 288 с.

*16. Подъяпольский, С.С.* Реставрация памятников архитектуры / С.С.Подъяпольский. – М.: Стройиздат, 1988. – 269 с.

*17. Подъяпольский, С.С.* Основы реставрации памятников архитектуры / С.С.Подъяпольский [и др.]. – М.: Стройиздат, 1983. – 270 с.

*18. Реставрация,* исследование и хранение музейных художественных ценностей. – Выпуск 2. Технические средства освещения музеев и реставрационных мастерских. – М.: Наука, 1984. – 48 с.

*19. Рэстытуцыя* культурных каштоўнасцей. Праблемы вяртання і сумеснага выкарыстання (юрыдычныя, навуковыя і маральныя аспекты). – Мн.: БелЭн, 1997. – 257 с.

*20. Самусік, А.Ф.* Помнікі гісторыі і культуры Беларусі / А.Ф.Самусік. – Мн.: БДЭУ, 2004. – 209 с.

*21. Сергачоў, С.* Традыцыі цяслярскага дэкору / С.Сергачоў // Мастацтва Беларусі. – 1986. – № 2. – С. 69 – 72.

*22. Реставрация,* исследования и хранение музейных и художественных ценностей. Полевая консервация археологических находок в СССР и за рубежом. – Выпуск 1. – М.: Наука, 1984 – 30 с.

*23. Слюнченко, В.Г.* Полоцкий Софийский собор. Историко-архитектурный очерк / В.Г.Слюнченко. – Мн.: Полымя, 1987. – 240 с.

*24. Список* памятников истории и культуры республиканского значения Белорусской ССР. – Мн.: БелСЭ, 1990. – Кн. 1. – 273 с.

*25. Страчаная* спадчына. – Мн.: Полымя, 1998. – 351 с.

*26. Локотко, А.И.* Архитектурное наследие Беларуси (развитие традиций, охраны и реставрация) / А.И.Локотко. – Мн.: ИООО “Право и экономика”, 2004. – 303 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*


1. *Адраджэнне*. – Віцебск, 2000. – 35 с.

2. *Асновы* кансервацыі і рэстаўрацыі: вучэбна-метадычны комплекс / Г.У.Савіцкі. – Віцебск: УО “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2006. – 65 с.

3. *Венецыянская* хартыя // Наша Ніва. – 1994. – № 8-9.

4. *Выгонная, А.А.* Основа реставрации памятников архитектуры, монументальной и станковой живописи / А.А.Выгонная, В.В. Калнін, М.М. Цейтліна. – Мн.: Дизайнпро, 2000. – 96 с.

5. *Никитин, М.К.* Химия в реставрации / М.К.Никитин, Е.П.Мельникова. – Л.: Химия, 1990. – 304 с.

6. *Мірскі* замак і замкі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Праблемы рэстаўрацыі і музеефікацыі. Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя, 4 чэрвеня 2005 г. г.п. Мір, Гродзенская вобл. / нав. рэд. Н.Ф.Высоцкая. – Мн.: ТАА “Белпрынт”, 2006. – 192 с.

7. *Семечкина, Е.В.* Реставрация тканей: методические рекомендации / Е.В.Семечкина. – М.: Наука, 1990. – 65 с.

8. *Федосеева, Т.С.* Материалы для реставрации живописи и предметов прикладного искусства. Изд. отдел Государственного научно-исследовательского института реставрации / Т.С.Федосеева. – М.: Навука, 1998. – 120 с.

9. *Школа* музейных кансерватараў: бюлетэнь. – 2005–2006. – 44 с.

10. *Вяртанне* – 2. Артыкулы, дакументы і архіўныя матэрыялы па праблемах помнікаў і вяртання нацыянальных каштоўнасцей, якія знаходзяцца за межамі Рэспублікі Беларусь / Беларускі фонд культуры. – Мн.: БелЭн, 1994 – 270 с.

11. *Вяртанне* – 3. Зборнік артыкулаў і дакументаў / Беларускі фонд культуры. – Мн.:БелЭн, 1996. – 256 с.

12. *Выяўленне,* сумеснае выкарыстанне і вяртанне архіўных, бібліятэчных і музейных каштоўнасцей, якія захоўваюцца ў замежных краінах // Вяртанне / пад рэд. А.Мальдзіса. – Мн.: БФК, 1999. – Вып. 6. – 372 с.

13. *Багласов, С.Г.* Реконструкция исторического центра Минска / С.Г.Багласов. // Строительство и архитектура Беларуси. – 1981.– № 2. – С. 1–12.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*14. Калнин, В.В.* Мирский замок: реставрация и приспособление / В.В.Калнин // Строительство и архитектура Беларуси. – 1983. – № 2. – С. 26–27.

*15. Каминскас, Р.* Памятники прошлого и современного / Р.Каминскас. – Вильнюс: Минтис, 1983. – 47 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**АСНОВЫ КАНСЕРВАЦЫІ І РЭСТАЎРАЦЫІ ПОМНІКАЎ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ**

*Вучэбная праграма для студэнтаў ВНУ па спецыяльнасці 23 01 12-03 – музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*


Рэдактар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2008 г. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,8. Ул.-выд. арк. 1,6.
Тыраж экз. Заказ .

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17
Ліцэнзія № 02330/0131818 ад 2.06.2006 г.

Надрукавана на рызографе
Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў
220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ